This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2025.pp.225-246

Przegląd Środkowo-Wschodni, 10, 2025
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20251009

Data przesłania: 07.05.2025
Data akceptacji: 17.06.2025

**Ігар Станкевіч**
Беларускі інстытут публічнай гісторы
igor.stankevich@gmail.com
ORCID: 0009-0004-6699-1465

# Антысавецкі партызанскі атрад у Плешчаніцкай воласці Барысаўскага павета ў святле матэрыялаў групавой крымінальнай справы 1921 года

**Antysowiecki oddział partyzancki w rejonie Pleszczanic w powiecie borysowskim w świetle materiałów zbiorowej sprawy karnej z 1921 r.**

Artykuł został przygotowany w oparciu o materiały sprawy karnej przechowywanej w Archiwum Akt Nowych (zespół 2478, teczka 651) zawierającej dokumenty z archiwum KGB Białorusi (sygn. 32449-c) dotyczące działalności antyradzieckiej formacji zbrojnej działającej od jesieni 1920 r. na terenie gminy Pleszczanice w powiecie borysowskim w guberni mińskiej.

Sprawa zatytułowana „Akta karno-śledcze w sprawie Edwarda Kasperowicza i innych oskarżonych o członkostwo w oddziałach gen. Bułak-Bałachowicza i o działalność agenturalną w 1921 r. na froncie zachodnim" liczy 110 stron. Są to kwestionariusze aresztowanych, protokoły przesłuchań, materiały oświadczeń osobistych, wnioski i uchwały organów Wydziału Specjalnego Frontu Zachodniego, odezwy do ludności, a także dokumenty dotyczące rehabilitacji uczestników oddziału. Materiały obejmują również fotografie poszczególnych członków oddziału.

Łącznie w aktach figuruje 19 osób w wieku od 17 do 54 lat, głównie katolików. Spośród nich 10 zostało skazanych na karę śmierci przez radziecki wymiar sprawiedliwości. Pozostali zostali zesłani lub przekazani pod nadzór CzeKa i milicji.

Dokumenty pozwalają odtworzyć przebieg śledztwa, ustalić dalsze losy skazańców i ich udział w formacji zbrojnej. Ramy chronologiczne tej sprawy obejmują okres od 28 marca do 18 sierpnia 1921 r.
Słowa kluczowe: wojna polsko-radziecka 1919-1920, antysowiecki opór zbrojny, Kazimierz Slaski

## Гістарычны кантэкст

12 кастрычніка 1920 г. прадстаўнікі Польшчы і савецкіх урадаў РСФСР і УССР падпісалі ў Рызе дамову аб замірэнні і прэлімінарных умовах міру. У выніку 18 кастрычніка на савецка-польскім фронце спыніліся баявыя дзеянні. Згодна з дамовай, абодва бакі мусілі адысці на 15 кіламетраў ад лініі фронту, што стварыла нейтральную зону паміж бакамі. Беларускія прадстаўнікі да перамоваў не былі дапушчаны. У другой палове кастрычніка 1920 г. бакі ратыфікавалі пагадненне. На савецкім баку пад кантролем бальшавікоў апынуліся шэсць паветаў былой Менскай губерні – Менскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Мазырскі, Слуцкі і Ігуменскі.

Беларускі нацыянальны лагер ніколі не пагадзіўся з вынікам польска-савецкага пагаднення. 20 кастрычніка 1920 г. Народная рада Беларускай Народнай Рэспублікі прыняла рэзалюцыю, у якой асудзіла падпісаную дамову. У дакуменце сцвярджалася, што Польшча і РСФСР *„неўпынна праводзячы ў жыццё сваю імперыялістычную палітыку, падзялілі Беларусь на дзве часткі, перадаўшы заходнія землі з нязначным польскім элементам (ад 0,2% да 8%, паводле польскай статыстыкі) пад кантроль Польшчы, а ўсходнія – пад фактычную юрысдыкцыю РСФСР”*[1].

[1] А. Тихомиров, *Проблемы определения восточной границы Польши в 1920–начале 1921 г.* Доступ 29.03.2025. Evolutio.info. ttps://evolutio.info/ru/journal-menu/2004-2/2004-2-tihomirov

## Паўстанцкі і партызанскі рух у памежных раёнах Беларусі ў 1920 годзе

Пасля падпісання Рыжскага пагаднення і стварэння нейтральнай зоны паміж польскімі і савецкімі войскамі, памежныя рэгіёны апынуліся ў стане палітычнай і вайсковай нестабільнасці. На гэтай тэрыторыі актывізаваўся ўзброены антысавецкі рух, які набыў рысы нацыянальна-вызвольнай барацьбы за незалежнасць Беларусі.

У лістападзе-снежні 1920 г. на поўдні Беларусі адбыўся вайсковы паход войск ген. Станіслава Булак-Балаховіча. Яны занялі Петрыкаў, Мазыр, Калінкавічы і Рэчыцу. 16 лістапада ў Мазыры С. Булак-Булаховіч абвясціў стварэнне беларускай дзяржавы, грамадзянская ўлада ў якой была перададзена Беларускаму палітычнаму камітэту (БПК). Адначасова быў выдадзены загад аб фармаванні беларускай дабраахвотніцкай арміі. Аднак паход пацярпеў паразу ад Чырвонай арміі, што прывяло да згортвання ініцыятывы. Іншая спроба стварыць незалежную беларускую дзяржаву мела месца ў Слуцкім павеце – у зоне, якая лічылася нейтральнай, але мела быць перададзенай пад кантроль савецкай улады. У лістападзе пад бела-чырвона-белымі сцягамі пачаліся выступленні ў Пагарэльскай і Якшыцкай валасцях[2].

Аналагічныя антысавецкія настроі адзначаліся ў Барысаўскім павеце. Беспартыйная канферэнцыя ў Халопенічах (валасны цэнтр Барысаўскага павета) ухваліла рэзалюцыю, у якой выказвалася жаданне *“мірным шляхам вызваліць Беларусь ад польскіх і савецкіх войскаў і даць ёй магчымасць вызначыцца без чыёй бы там ні было дыктатуры”*[3].

Спробы стварэння незалежнай Беларусі выклікалі сур’ёзную занепакоенасць у кіраўніцтва РСФСР і ССРБ. Партызанскі рух у афі-

---

[2] Гл. больш: *Слуцкі збройны чын 1920 г.у дакументах і ўспамінах,* укл.: А. Гесь, У. Ляхоўскі, У. Міхнюк, Менск 2006.

[3] Н. Стужынская, *Беларусь мяцежная. З гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 20-я гг. ХХ ст.* Вільня 2000, с. 16.

цыйных дакументах яны кваліфікавалі як «палітычны бандытызм», а яго ўдзельнікаў падвяргалі крымінальнаму пераследу. У лістападзе 1920 года савецкія органы распачалі аперацыі па ліквідацыі паўстанцкіх груповак, апісваючы гэта як «барацьбу з бандытызмам».

Паводле паведамлення Барысаўскага камісара кіраўніку рэўкаму ССРБ А. Чарвякову ад 28 кастрычніка 1920 года, сітуацыя ў рэгіёне была надзвычай трывожнай:

> Зялёная армія ў Барысаўскім павеце разраслася да немагчымых памераў. Няма ніводнай воласці, дзе не дзейнічалі б банды. Асабліва шмат іх у тых валасцях, дзе ёсць прыродныя схованкі. Паводле чутак, па ўсім павеце налічваецца некалькі тысяч бандытаў. У цяперашні час банды дзейнічаюць адкрыта. Яны напалі на Гайна-Слабаду і мястэчка Плешчаніцы, якое некаторы час знаходзілася ў іх руках[4].

У данясенні камісара Менскага павета ад 15 лістапада 1920 года адзначалася:

> Насельніцтва некаторых валасцей, даведаўшыся пра самавызначэнне Беларусі, не прызнае ніякай улады, акрамя неіснуючага ўраду „незалежнай Беларусі”, і ставіцца вельмі варожа да арганізуемых валасных рэўкамаў, заяўляючы, што ўладу трэба выбіраць, а не прызначаць з Масквы[5].

11 снежня 1920 года Сакрэтны аддзел Усерасейскай Надзвычайнай камісіі (УНК) падрыхтаваў даклад аб паўстанцкім руху па ўсёй тэрыторыі краіны. Асобны IV раздзел яго быў прысвечаны аналізу становішча ў Заходнім раёне, куды ўключаліся Віцебская, Смаленская, Менская і Гомельская губерні. Паводле чэкісцкай ацэнкі, менавіта гэтыя тэрыторыі ўяўлялі сабой асабліва спрыяльнае асяроддзе для развіцця ўзброенага паўстанцкага руху, які ў дакуменце

---

[4] Н. Стужынская *Слуцкае паўстанне.* Доступ 29.03.2025. https://history-belarus.com/images/img-events/uprising_sluzk/slutskae_paustanne_N-Stuzinskaja.pdf

[5] Н. І. Стужынская *Беларусь мяцежная. З гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 20-я гг. XX ст.* Вільня, 2000. С. 16.

характарызаваўся як “бандытызм”. Сярод асноўных фактараў, што садзейнічалі росту руху, адзначаліся частая змена ўлады, няўстойлівае становішча савецкай улады, наяўнасць вайсковых аперацый (наступленняў і адступленняў), высокая ступень палітычнай і этнічнай напружанасці, а таксама актыўная антысеміцкая і белагвардзейская прапаганда.

Асаблівая ўвагу ў дакладзе звярталася на тое, што *“апошняе польскае наступленне дало значны імпульс развіццю і ўзмацненню бандытызму ў Заходнім раёне”*.[6] Чэкісты сцвярджалі, што ў арганізацыі і падтрымцы паўстанцкіх груповак былі задзейнічаныя:

> белагвардзейцы, яўныя і схаваныя польскія легіянеры, польскае духавенства, шпіёны Польшчы, Літвы і Латвіі”, якія, на думку аўтараў даклада, мэтанакіравана арганізоўвалі і ідэалагічна падрыхтоўвалі ўзброены супраціў супраць Савецкай улады на «палітычнай падкладцы[7].

У якасці прыкладу ў дакуменце прыводзілася армія С. Булак-Балаховіча, якая, як сцвярджалася, *“на 50% складалася з бандытаў, калі не болей”*. Гэтае войска апісвалася як неарганізаваная *“маса дэзерціраў – цёмных, забітых (забітых духоўна) беларусаў, атручаных хлуснёй і паклёпам, апрацоўвалася ў адпаведным духу агентамі БелаПольшы”*[8].

Сярод дадатковых фактараў, што спрыялі развіццю антысавецкага ўзброенага руху на тэрыторыі заходніх губерняў былой Расейскай імперыі, у дакладзе асабліва адзначаліся прыродныя ўмовы рэгіёна. Густыя лясныя масівы прадстаўлялі зручную натуральную базу для дзейнасці паўстанцкіх груповак. Яны выконвалі ролю сховішчаў, абарончых рубяжоў і лагераў, што значна ўскладняла правядзенне карных аперацый з боку савецкіх улад. Паводле

---

[6] Доклад секретного отдела ВЧК о повстанческом движении по состоянию на ноябрь 1920 г. 11 декабря 1920 г. Доступ 29.03.2025. https://docs.historyrussia.org/ru/nodes/39314-doklad-sekretnogo-otdela-vchk-o-povstancheskom-dvizhenii-po-sostoyaniyu-na-noyabr-1920-g-11-dekabrya-1920-g#mode/inspect/page/7/zoom/4

[7] Тамсама.

[8] Тамсама.

ацэнкі чэкістаў, у Заходнім краі ўзброены супраціў набыў зацяжны, хранічны характар. Асабліва напружанай заставалася сітуацыя ў так званай "цэнтральнай зоне" – на лініі дэмаркацыі паміж тэрыторыямі, што кантраляваліся Савецкай Расеяй і Польшчай. Тут адзначалася адсутнасць устойлівай дзяржаўнай улады, што спрыяла актывізацыі "бандыцкіх элементаў", якія *"арганізоўваліся, узбройваліся за кошт дапамогі з боку Польшчы, Літвы і Латвіі і здзяйснялі рэйды на тэрыторыю савецкай Беларусі"*[9].

Таксама адзначалася дэзарганізацыя дзейнасці мясцовых камуністычных арганізацый, іх нездольных уплываць на грамадскія настроі. Згадваліся нават выпадкі пераходу асобных членаў партыі на бок узброенага супраціву. Асабліва неспрыяльная абстаноўка, паводле даклада, складвалася ў Мазырскім павеце, а таксама ў Барысаўскім і Бабруйскім паветах Менскай губерні, яна характарызавалася як *"пастаянныя ачагі хуліганства і бандытызму, пагромаў і забойстваў савецкіх работнікаў і іншых грамадзян"*[10].

24 лістапада 1920 года Савет Працы і Абароны РСФСР (СПА) прыняў пастанову аб рэарганізацыі сістэмы аховы дзяржаўных межаў. У адпаведнасці з дакументам, кантроль за выкананнем гэтай задачы пераходзіў да Асобага аддзела Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі (УНК), які ад таго часу адказваў за забеспячэнне пагранічнай бяспекі на ўсёй тэрыторыі Савецкай Расеі.

На тэрыторыі Беларусі ахова мяжы з Польшчай была даручана Асобнаму аддзелу Заходняга фронту. У яго кампетэнцыю ўваходзілі не толькі ваенна-пагранічныя задачы, але і шырокі спектр функцый у галіне дзяржаўнай бяспекі. Асобны аддзел займаўся контрразведкай, выяўленнем і нейтралізацыяй замежных шпіёнскіх сетак, папярэджаннем дыверсійнай дзейнасці, а таксама барацьбой з антысавецкімі ўзброенымі фармаваннямі і "бандытызмам", які ў дакументах таго часу часта выкарыстоўваўся як тэрмін для абазначэння

[9] Тамсама.
[10] Тамсама.

ўсіх формаў узброенага супраціву савецкай уладзе. Акрамя таго, у функцыі аддзела ўваходзіла правядзенне карных акцый, уключаючы арышты, допыты, а таксама вынясенне прысудаў паводле паскоранай працэдуры, часта без удзелу суда. Такім чынам, Асобны аддзел выконваў ролю магутнага палітычнага інструмента ўнутранага кантролю, рэпрэсій і ўсталявання савецкай улады ў рэгіёне, які заставаўся нестабільным і схільным да антысавецкіх выступленняў.

## Следчыя дзеянні ў дачыненні да ўдзельнікаў антысавецкага ўзброенага фармавання ў Барысаўскім павеце

Да ліку раёнаў БССР, на якіх назіраліся антысавецкія настроі, належыла Барысаўшчына. У дадзеным артыкуле мы спынімся на разглядзе асобнай крымінальнай справы, якая кідае святло на грамадска-палітычную сітуацыю ў гэтым рэгіёне. У перыяд з 1918 па 1920 гг. вёскі Пушчэнка, Завіша, Рудня-Завішанская, Ляўданшчына, Хатаевічы, Расохі ў Плешчаніцкай воласці Барысаўскага павета Менскай губерні перажылі некалькі этапаў акупацыі: спачатку нямецкімі войскамі, потым польскімі, савецкімі, зноў польскімі, і ў канчатковым выніку апынулася пад кантролем бальшавікоў. Штуршком да з’яўлення партызанскага атрада на гэтай тэрыторыі з’явілася абвешчаная саветамі мабілізацыя ў Чырвоную армію. Найбольшую актыўнасць атрад праявіў падчас адступлення Чырвонай арміі восенню 1920 года пасля няўдалага паходу на Варшаву.

З 25 сакавіка па 1 красавіка 1921 года Асобы аддзел УНК №5 3-й арміі Заходняга фронту правёў шэраг арыштаў сярод жыхароў вёсак Пушчанка, Завіша, Расохі і Хатаевічы. Сярод затрыманых былі Маруся Шастаковіч (19 гадоў), Сафія Спявацкая (32 гады), Адам Даніловіч (54 гады), Міхаіл Мішкін (32 гады), Пётр Кішкурна (19 гадоў) і Эдуард Каспяровіч (18 гадоў). З дакументаў вынікае, што большасць арыштаваных утрымліваліся ў мястэчку Хатаевічы. 28 сакавіка вайсковы следчы Буянаў пачаў допыты. У першы дзень

ён зафіксаваў паказанні Марусі Шастаковіч. Яна паведаміла, што ў кастрычніку 1920 г. 15 чалавек бандытаў напалі на адступаючыя часткі Чырвонай арміі, рабавалі абозы, раззбройвалі чырвонаармейцаў і забівалі камуністаў. Шастаковіч згадала, што ў яе кватэры ночылі двое чырвонаармейцаў 182-га палка 21-й дывізіі, якіх затым распранулі і раззброілі бандыты. Яна таксама заявіла, што бандыты забілі начальніка сувязі 14-га палка і паранілі чырвонаармейца 500-га палка,[11] а ў лесе паміж вёскамі Пушчанка, Забелі і Завіша забілі валаснога камісара Плешчанскай воласці Беляковіча. Шастаковіч назвала больш за 20 прозвішчаў удзельнікаў аддзела. Адама Данілевіча яна назвала камендантам "шайкі бандыдтаў", які даваў загад збіраць патроны для падначаленых. Патроны збірала Сафія Спявацкая.

Сам Адам Данілевіч, арыштаваны 25 сакавіка, падчас допыту 30 сакавіка заявіў, што чуў пра 15 бандытаў і бачыў чатырох у доме Шастаковіч, калі тыя распраналі чырвонаармейцаў[12]. Ён прызнаўся, што ведаў пра забойства Бяляковіча, але сцвярджаў, што ў бандзе сам не ўдзельнічаў. Пазней, на допыце 1 красавіка, Данілевіч дадаў у паказанні, што каля вёсак Расохі і Пушчанка знаходзіліся дзве групы бандытаў, якія нападалі на адступаючыя чырвонаармейскія падраздзяленні.

30 сакавіка на допыце Сафія Спявацкая паказала, што ў наваколлі вёсак Пушчанка, Завішына і Хатаевічы дзейнічала ўзброеная групоўка колькасцю каля 35 чалавек[13]. Яна пацвердзіла, што гэтыя людзі нападалі на чырвонаармейскія абозы, раззбройвалі і распраналі жаўнераў Чырвонай арміі, і забілі Беляковіча.

Міхаіл Мішкін падчас допыта 31 сакавіка сцвярджаў, што пра банду нічога не ведае, бо вярнуўся дадому толькі ў лютым 1921 г.

---

[11] AAN 2/2478/0/2/651 Akta karno-śledcze w sprawie Edwarda Kasperowicza i innych oskarżonych o członkostwo w oddziałach gen. Bułak-Bałachowicza i o działalność agenturalną w 1921 r. na froncie zachodnim, s. 2.

[12] Тамсама, с. 10.

[13] Тамсама, с. 4.

З траўня да сярэдзіны чэрвеня 1920 г. ён служыў у чырвонаармейскім абозе, дайшоў да Ліды, дзе захварэў і трапіў у шпіталь. Калі выздаравеў, горад ужо быў пад кантролем польскіх улад. Мішкіну далі пропуск для вяртання дадому і адпусцілі.

У той жа дзень Эдуард Каспіровіч таксама паказаў, што не мае інфармацыі пра дзейнасць банды і не валодае звесткамі пра забойства Беляковіча.

У сваю чаргу Пётр Кішкурна сведчыў, што ў кастрычніку 1920 г. цяжка захварэў і заставаўся дома да студзеня 1921 г. Ён адзначыў, што падчас адступлення чырвоных чуў страляніну ў лесе, а праз два дні даведаўся пра забойства старшыні Плешчанскага валрэўкама. Але хто ўчыніў забойства, ён не ведае бандытаў не бачыў, сам у дзейнасці групоўкі не ўдзельнічаў і сябе вінаватым не лічыць.

4 красавіка вайсковы следчы Асобага аддзела №5 Буянаў склаў заключэнне па справе №11, якая тычылася абвінавачання ў бандытызме Сафіі Спявацкай, Міхаіла Мішкіна, Эдуарда Каспяровіча, Адама Даніловіча, Пятра Кішкурны (у дакументах пазначаны як Кушняровіч), Івана Трухана і Іосіфа Дэйнара.

Ён адзначыў, што паводле сведак Марусі Шастаковіч і Сафіі Высоцкай, Сафія Спявацкая збірала патроны для бандытаў і перадавала ім ежу ў лес. Плешчанецкі ваенкам Калесін (пратакол паказанняў адсутнічае) заявіў, што Міхаіл Мішкін здзейсніў замах на яго жыццё. Шастаковіч, Высоцкая і Даніловіч сцвярджалі, што Мішкін непасрэдна ўдзельнічаў у дзейнасці банды.

Следчы таксама адзначыў, што ўдзельнікамі антысавецкага фарміравання з’яўляліся Эдуард Каспяровіч і Адам Даніловіч. Апошні дзейнічаў як камендант атрада, асабіста ўдзельнічаў у раззбраенні чырвонаармейцаў разам з Іосіфам Дэйнарам, Эдуардам Каспяровічам, Пятром Кішкурнам і іншымі[14].

У дачыненні да Пятра Кішкурны следчы зафіксаваў, што той служыў добраахвотнікам у польскім войску, што пацвярджаецца

[14] Тамсама, с. 15.

фатаграфіяй у адпаведнай форме. Паводле Даніловіча, Кішкурна доўгі час адсутнічаў дома, аднак прымаў удзел у дзейнасці банды, у тым ліку ў раззбраенні чырвонаармейцаў[15]. У склад банды следчы ўключыў таксама  Івана Трухана і Іосіфа Дэйнара.

Паводле прадстаўніка Асобага аддзела, названыя асобы з кастрычніка па лістапад 1920 г. здзяйснялі дзеянні, накіраваныя на падрыў савецкай улады і стварэнне пагрозы для мясцовага насельніцтва. Буянаў пастанавіў утрымліваць іх пад вартай у Асабым памежным аддзяленні №2 да распараджэння. Пад заключэннем подпіс Буянава і рэзалюцыя начальнікам Асобага аддзела №5 (подпіс неразборлівы).

У той час, калі праводзілася следства, у матэрыялах справы з'яўляюцца дакументы, якія сведчаць пра спробы мясцовага насельніцтва абараніць сваіх сваякоў і землякоў. Гэтыя дакументы, датаваныя 4–7 красавіка 1921 г., маюць незвычайную назву – "Прысуд" ("Приговор"), аднак па зместавым характары яны з'яўляюцца калектыўнымі хадайніцтвамі ў абарону арыштантаў.

Аўтары зваротаў - жыхары вёсак Пушчанка, Расоха, Забегі, Вардаўшчына, Прыходы і іншых населеных пунктаў рэгіёна - адзначалі добрасумленныя паводзіны затрыманых, іх станоўчае стаўленне да савецкай улады і іх няўдзел у бандыцкіх дзеяннях. Хоць у тэкстах не пазначаны адрасат, сам факт уключэння дакументаў у матэрыялы справы дазваляе меркаваць, што яны былі накіраваныя ў Асобы аддзел №5 або іншым структурам савецкай улады.

У прыватнасці, у абарону Івана Трухана вяскоўцы пісалі: *"Агітацыі не рабіў. Да Савецкай улады ставіўся душэўна і спачувальна. З 23 лютага 1921 года займаў пасаду ў Лаінскім лясніцтве ў абыходзе №24 – 3 аб'езду, таму просім вызвалення з-пад арышту Івана Трухіна, за што ручаемся сваёй маёмасцю за яго чэсныя паводзіны, у чым і падпісваемся"*[16]. У аналагічным лісце ў абарону

[15] Тамсама, с. 16.
[16] Тамсама, с. 39.

Пятра Кішкурны сцвярджалася: *“Пётр Кішкурна сапраўды падчас адступлення чырвоных войск хварэў на тыф і ляжаў у сваім памяшканні, хварэючы 2 месяцы, нікуды не адлучаўся, стала знаходзіўся дома, адбываў ваеннае вучэнне ў мястэчку Плешчаніца. І мы ўсе ручаемся за Пятра, што ён паводзінаў добрых”*[17]. Падобныя звароты былі скіраваныя і ў абарону Сафіі Спявацкай, Іосіфа Дэйнара і Адама Данілевіча. Частка дакументаў была афіцыйна заверана мясцовымі ўладамі. Так, на адным з калектыўных зваротаў стаіць дата - 9 красавіка 1921 г., пячатка валаснога выканкама і подпіс кіраўніцтва Плешчаніцкага сельсавета з наступнай пазнакай: *“Подпісы ўсіх сведкаў Плешчаніцкі сельсавет засведчыў. Старшыня М. Шаўчэнка, за сакратара А. Макей”*[18].

Ці была рэакцыя на хадайніцтвы з боку прадстаўнікоў Асобага аддзела невядома? Адпаведныя дакументы, якія маглі б сведчыць пра вынікі разгляду зваротаў, у следчай справе адсутнічаюць.

8 красавіка на бланках Асобага аддзела УНК 3-й арміі былі складзены анкеты арыштаваных у справе аб бандыцкай дзейнасці. Анкетныя формы ўтрымліваюць стандартны набор звестак: прозвішча, імя, прыналежнасць да дзяржаўнай юрысдыкцыя (усе фігуранты пазначаны як грамадзяне РСФСР), месца нараджэння і пражывання, узрост, узровень пісьменнасці, склад сям’і і блізкія сваякі, прафесія да і пасля 1917 г., звесткі пра службу ў войску, а таксама дата, месца і акалічнасці арышту.

Арышт і допыты ў большасці выпадкаў праводзіліся вайсковым следчым паста або асобага аддзела №5. Як месца ўтрымання арыштаваных найчасцей указваецца мястэчка Хатаевічы. Разам з тым, у анкетах Міхаіла Мішкіна і Івана Трухіна адзначана, што яны ўтрымліваліся адпаведна ў вёсках Завішына-Рудня і Пушчанка. У графе *„падставы: дакументальныя дадзеныя”*, якая павінна змяшчаць абгрунтаванне арышту, адзначана кароткае – *„былі”*.

[17] Тамсама, с. 47-48.

[18] Тамсама, с. 44.

Гэта сведчыць пра тыпавы фармальны падыход да юрыдычнага афармлення працэсуальных дакументаў у дадзенай справе.

У анкетах прысутнічаюць фотаздымкі асобных арыштаваных. У графе *„нацыянальнасць”* усе фігуранты пазначаны як рыма-каталікі, за выключэннем Івана Трухіна. Ён фігуруе як рускі.

18–19 красавіка вайсковы следчы памежнага асобага аддзялення №2 Заходняга фронту В. Цітоў разгледзеў матэрыялы справы №244. Ён прыйшоў да высновы пра наяўнасць прыкмет злачынства і неабходнасць далейшага крымінальнага пераследу. Цітоў падкрэсліў, што злачынства адбылося ў межах кампетэнцыі асобага аддзела, і пастанавіў прад’явіць афіцыйнае абвінавачанне ў бандытызме Пятру Кішкурну, Адаму Данілевічу, Івану Трухіну, Эдуарду Каспяровічу, Іосіфу Дэйнеру, Міхаілу Мішкіну і Сафіі Спявацкай. Мерай утрымання да ўсіх абвінавачаных следчы абраў ўтрыманне пад вартай. Пад пастановамі стаяць подпісы арыштаваных. За непісьменных Сафію Спявацкую і Адама Данілевіча распісаліся Іван Трухін і адзін з прадстаўнікоў сям’і Сляскіх[19].

18 красавіка Цітоў працягнуў допыты абвінавачаных. У паказаннях Сафіі Спявацкай змяшчаецца шэраг звестак, што характарызуюць склад і маршруты ўзброенай групы ў рэгіёне. Спявацкая паказала, што ў жніўні 1920 г. да іх пачалі рэгулярна заходзіць удзельнікі ўзброенага атраду і пералічыла некалькі прозвішчаў. Таксама жанчына заявіла, што разам з мясцовымі былі два невядомыя палякі, якіх яна называла „пазнанцамі”. Апошнія, паводле яе слоў, давалі загады іншым удзельнікам групы. На наступных допытах іншыя арыштаваныя таксама пацвярдзілі прысутнасць гэтых замежных асобаў. Адам Данілевіч, напрыклад, апісаў іх як людзей у польскіх шынялях, *“якія нават не умелі размаўляць па-рускі”*[20].

Паводле сведчанняў Спявацкай, асноўным месцам знаходжання і прытулку групы быў хутар Антонаўка памешчыка Сляскага па

[19] Тамсама, с. 31-37.
[20] Тамсама, с. 68.

мянушцы „Шустрык”[21]. Яна сцвярджала, што асабіста назірала, як члены ўзброенай групы заходзілі ў дамы Адама Данілевіча і Эдуарда Касяпровіча, а таксама што ў кастрычніку 1920 г. Мечыслаў Сляскі разам з двума пазнанцамі сыйшлі ў Польшчу.

Спявацкая пацвердзіла ўдзел у „бандыцкай” дзейнасці Эдуарда Касяпровіча, Іосіфа Дэйнера, Міхаіла Мішкіна, Пятра Кішкурны, Адама Данілевіча і Івана Трухіна. Паводле яе паказанняў, Іван Дэйнер выказваў ёй пагрозы: *“Калі хоць аднаго нашага зяленага хто пасмее выдаць, то мала, што расстраляю, але спалю ўсю вёску!”*[22]

Ацэньваючы колькасны склад атрада, Спявацкая называла лічбу ад 15 да 35 чалавек[23]. У паказаннях, зафіксаваных следчым пад загалоўкам “Дадаткова” (без даты), яна распавяла пра напад больш чым 30 удзельнікаў атраду на чырвонаармейскі абоз, які рухаўся з Хатаевічаў у Нястанавічы[24]. Падчас нападу быў забіты конь, але абоз адступіў. Праз некаторы час яна ўбачыла сядло з забітага каня ў Шастаковіча Аляксандра, але яно з цягам часу перайшло да Малішэўскага. У гэтых жа паказаннях Спявацкая перадае інфармацыю, атрыманую ад Казіміра Сляскага (відаць, таксама арыштаванага): што яго старэйшы сын Казімір знаходзіцца ў Польшчы, але ўладам ён паведаміў толькі пра двух малодшых сыноў.

На наступны дзень, 19 красавіка, Цітоў дапытаў Эдуарда Каспіровіча, Пятра Кішкурна, Міхаіла Мішкіна, Іосіфа Дэйнера, Адама Данілевіча. Мішкін Міхаіл з вёскі Рудня-Завішанская распавёў, што служыў у царскім войску ў 168 Міргарадскім палку да студзеня 1918 г., а пасля вярнуўся дадому, меў 97 дзесяцін зямлі і 9 душ сямейства. Ён цалкам адмаўляў удзел у бандзе, спасылаючыся на працяглую хваробу на тыф і адсутнасць дома, і заявіў, што пра Сляскага і забойства Беляковіча нічога не ведае.

[21] Тамсама, с. 50.
[22] Тамсама, с. 51.
[23] Тамсама.
[24] Тамсама, с. 52.

Са слоў Іосіфа Дэйнера з вёскі Пушчанка, следчы зафіксаваў, што той скончыў сельскую вучэльню, меў 3 дзясцін зямлі і 9 душ сямейства. Дэйнер заявіў, што бандыты прыходзілі ў вёску ў верасні 1920 г. Разам з імі былі Дэйнер Іван і два паляка. Яны сілай прымушалі іх карміць. У вёсцы, па словах маладзёна, бандыты заходзілі да Адама Данілевіча. Арыштаваны дадаў падрабязнасцей ў справу забойства старшыні валаснога выканкама Беляковіча. Ён сказаў, што разам з Беляковічам ехаў сябра валвыканкама Андрушкевіч, якога забілі далей на полі. Хаця Дэйнер адмаўляў свой удзел у бандзе, асабістая стаўка з Данілевічам Адамам яго выкрыла: апошні засведчыў, што бачыў Іосіфа сярод партызанаў.

Пётр Кішкурна з вёскі Расохі на допыце заявіў, што займаўся хлебаробствам, меў 4 дзесяціны зямлі і 4 чалавекі ў сям'і. Кішкурна не толькі не даў паказанняў, але і не падпісаў пратакол. Пры гэтым асабістая стаўка з Станіславам Мніховічам паказала іншае. Мніховіч заявіў, што Кішкурна добраахвотна служыў у польскім войску і прызнаваўся ў гэтым.

Адам Данілевіч з вёскі Пушчанка займаўся хлебаробствам і меў 7 дзесяцін зямлі ды 7 душ сям'і. Ён распавёў, што пасля сыходу немцаў у 1918 г. яго абралі старшынём вёскі. Але займаў гэтую пасаду ён усяго 3 месяцы да прыходу палякаў, а пасля вяртання Чырвонай арміі ў 1920 г. зноў заняў пасаду, праўда, толькі на 7 дзён. У гэты час, прыкладна ў ліпені 1920 г., савецкія органы пачалі мабілізаваць моладзь у свае вайсковыя аддзелы. Данілевіч атрымаў загад скіроўваць ўсіх маладзёнаў у ваенкамат. Тады і пачалі з'яўляцца партызанскія групы. Данілевіч назваў 15 прозвішчаў удзельнікаў групы. Ён сцвярджаў, што асабіста вінтоўкі не меў, у бандз і ў раззбраенні чырвонаармейцаў на кватэры Марусі Шастаковіч не ўдзельнічаў. Пад пратаколам допыту адбітак яго вялікага пальца правай рукі - сведчанне непісменнасці.

Іван Трухін з Пушчэнкі заявіў, што бандыты некалькі разоў прыходзілі ў вёску ў верасні 1920 г., заходзілі да Адама Данілевіча і Сафіі Спявацкай. Ён заявіў, што арганізатарам бандытаў быў

Казімір Сляскі, а на яго хутары Антонаўка было забіта 5 чырвонаармейцаў[25]. Там жа пражывалі бандыты і два палякі, а Сафія Спявацкая прыносіла патроны. Свой удзел у бандзе Трухін адмаўляў, аднак падчас асабістай стаўкі Адам Данілевіч паказаў, што бачыў яго з бандытамі, але без зброі. Тады Трухін прызнаўся, што хадзіў з бандытамі, але без вінтоўкі, а разам з ім былі сам Адам Данілевіч, Каспіровіч Эдуард і Дэнейр Іван з вінтоўкамі, і Дэйнер Іосіф без вінтоўкі[26].

Адным з ключачых удзельнікаў групы для следства стаў Эдуард Каспіровіч. Ён атрымаў пачатковую адукацыю ў царкоўнай школе, працаваў шаўцом, валодаў чвэрцю дзесяціны зямлі і меў сям'ю з трох чалавек. Па сямейных абставінах пераехаў у Хатаевічы, дзе і быў арыштаваны. На допыце 19 красавіка Каспіровіч адмаўляў свой удзел у атрадзе. Пра забойства старшыні Беляковіча сцвярджаў, што бачыў, як таго правозілі праз мястэчка, але падрабязнасцей не ведае, а са Сляскім пазнаёміўся толькі ў турме. На паўторным допыце ён цалкам адмовіўся ад паказанняў, матывуючы гэта тым, што "нічога не ведае".

Аднак на асабістай стаўцы (дата не пазначана) Уладзіслаў, Фелікс і Кліменцій Леаданскія заявілі, што бачылі Каспіровіча сярод узброенай групы з дзесяці чалавек. Уладзіслаў Леаданскі паведаміў, што Каспіровіч казаў: *"Калі б у нас былі вінтоўкі, то ўсіх прымусілі б ісці з намі"*[27]. Сафія Спявацкая на асабістай стаўцы сцвярджала, што Каспіровіч пагражаў ёй расправай у выпадку выдачы ўдзельнікаў партызанскага атраду. Прысутныя чырвонаармейцы Іванам Дудушкіным і Іванам Шульга засведчылі, што Каспіровіч адмовіўся падпісаць і гэты пратакол.

14 траўня на допыце Каспіровіч змяніў лінію паводзінаў і пачаў актыўна супрацоўнічаць са следствам. Ён паведаміў, што бачыў

[25] Тамсама, с. 71.
[26] Тамсама, с. 72.
[27] Тамсама, с. 56.

Казіміра Сляскага яшчэ ў снежні 1920 года, а таксама даў шэраг падрабязных звестак пра дзейнасць партызанскага атраду. У дадатковых паказаннях ад 16 траўня ён распавёў, што ўзброеная група ўзнікла восенню 1920 г. у Плешчынскай і Крайскай валасцях — у перыяд узмацнення мабілізацыі ў Чырвоную армію. Асноўным месцам дыслакацыі атраду быў хутар Антонаўка Сляскага. Паводле яго, тут збіралася больш за 40 чалавек. Туды ж, відаць, дзеля забеспячэння групы правізіяй і лагістыкі, сагналі каля 30 кароў і 20 коней[28].

Каспіровіч асобна адзначыў пастаянную прысутнасць двух палякаў-пазнанцаў і назваў іх прозвішчы - Кенздня і Думброўскі. Паводле яго слоў, яны кожны дзень сыходзілі ў лес, дзе, верагодна, кантралявалі або каардынавалі дзеянні групы, а вечарамі вярталіся на хутар. Палякі абяцалі ўдзельнікам атраду зямлю пасля прыходу польскай улады, а Сляскі — добрую рэкамендацыю[29].

Кульмінацыяй паказанняў стала апісанне канкрэтнага інцыдэнта, калі партызаны абстралялі чырвонаармейскі абоз каля вёскі Пушчэнкі. Яны забілі толькі каня і захапілі з абозу пяць коней, тры пары бялізны, адну вінтоўка і два сядлы. Нарэшце Эдуард Каспіровіч не толькі прызнаў сябе вінаватым. Ён пацвердзіў, што быў удзельнікам узброенага нападу на абоз, разам з Адамам Данілевічам з двухствольнай паляўнічай стрэльбай, Пятром Сухадольцам, Станіславам і Іванам Андрушкевічамі, Іосіфам і Ігнатам Леанданскімі, Пятром і Ігнатам Юрэвічамі. Нападам кіравалі Кенздня і Думброўскі[30].

Пазней, 16 траўня, Іван Трухін на дадатковым допыце паведаміў, што ў турме Эдуард Каспіровіч распавёў яму акалічнасці забойства старшыні валрэўкама Беляковіча. На Беляковіча напалі Эдуард Каспіровіч, Петр Юрэвіч і Малішэўскі. Старшыня спрабаваў уцячы

[28] Тамсама, с. 57.
[29] Тамсама, с. 58.
[30] Тамсама.

і кінуў гранату, аднак выбух не забіў і нават не параніў напаснікаў[31]. Ён прасіў не забіваць яго, але Пётр Юрэвіч параніў Беляковіча, а потым разам Эдуардам Каспіровічам яны дабілі прадстаўніка савецкай улады. Таксама Трухін данёс словы Казіміра Сляскага, пачутыя ў турме: *“Калі мы сябе ахвяравалі, то няма чаго шкадаваць. Толькі дурні, што здаліся”*[32].

19 красавіка вайсковы следчы пагранасобаддзялення №2 Заходняга фронта Цітоў разгледзеў справу № 244 і вырашыў, што справа патрабуе дадатковага следства. Ён пастанавіў прыняць справу да вытворчасці і прад’явіць абвінавачанне ва ўдзеле ў “бандыцкай хеўры” Міхаілу Мішкіну, Іосіфу Дэйнеру, Пятру Кішкурне, Эдуарду Каспіровічу, Івану Трухіну і Адаму Данілевічу, а Сафіі Спявацкай у садзейнічанні ў бандытызме, а мерай стрымання абраць для іх утрыманне пад вартай. З даведкі вядома, што Сляскі Казімір, Каспіровіч Эдуард, Дэйнер Іосіф Мішкініс Міхаіл, Кішкурна Пётр, Данілевіч Адам, Кудрэвіч Антон, Трухон Іван, Мніхавіч Стэфан утрымліваліся пад вартай у лепельскім арыштанцкім доме і лічыліся за пагранасобаддзелам №2 Заходняга фронта[33].

21 траўня Цітоў, разглеўшы справы №№ 244, 225, 275, 298, 141 а, 292, вынес заключэнне і абвінаваціў 19 чалавек у арганізацыі партызанскага атрада на карысць Польшчы, бандытызме, распаўсюджванні пракламацый на карысць Балаховіча і шпіянажы. Заключэнне насіла яркую палітычную афарбоўку. Дзейнасць групы следчы ахарактарызаваў як *“моцныя здрадлівыя ўдары ў спіну, ад затоеных свядомых класаў і мала свядомых ворагаў Рэспублікі”*. У аналітычнай частцы Цітоў апісвае абвінавачаных як *„рымска-каталіцкіх, нацыяналістычна настроеных”* і сцвярджаў, што яны з’яўляюцца *„непрымірымымі ворагамі РСФСР і рускага народу”*, згуртаванымі вакол свайго *“вяльможнага пана” Сляскга, які заду-*

[31] Тамсама, с. 72.
[32] Тамсама, с. 73.
[33] Тамсама, с. 75.

*маў дапамагчы сваёй „Айчыне”, заклікаючы маласвядомых, але такіх жа фанатыкаў суседзяў да барацьбы з бальшавікамі”*[34].

Менавіта Казімір Сляскі, па перакананні следчага, быў арганізатарам “банды”. Сляскі асабіста і з іншымі асобамі хадзіў па вёсках і хутарах, збіраў зброю і агітаваў сярод моладзі ісці за *“Айчыну”* і *“ахвяраваць сваім жыццём і дабром для дасягнення панскага царства Беларусі”*[35]. Нават у турме, паводле дакумента, Сляскі агітаваў сваіх „хлопцаў”: *“ШТО МЫ АХВЯРАВАЛІ СЯБЕ ДЗЕЛЯ ВЯЛІКАЙ МЭТЫ І ГІНЕМ, НЕ ШКАДУЮЧЫ АБ ГЭТЫМ НІСКОЛЬКІ. ШКАДА ТОЛЬКІ, ШТО ТАННА ПРАДАЛІ СВАЁ ЖЫЦЦЁ”*[36]. Цытату следчы запісаў вялікімі літарамі. Варта адзначыць, што пратаколы допытаў Казіміра Сляскага ў справе адсутнічаюць.

Бяздоказна Цітоў сцвярджаў, што хлопцаў, якія ішлі добраахвотна і па мабілізацыі ў Чырвонае войска, партызаны захоплівалі і сілай зброі прымушалі вяртацца дадому або ўступаць да іх у банду, нават распраўляліся з некаторымі на месцы. Цітоў адначаў, што банда *“тэрарэзіравала мясцовае насельніцтва”*, аднак пры гэтым прызнаваш, што яна сустракала спачуванне ў большасці: *“сем’і бандытаў, душой адданыя свайму панству, спачуваючы бандытам, хаваючы іх, дапамагалі ім у налётах, вялі разведку, нарыхтоўвалі харчаванне”*[37].

Цэнтрам партызнскага атраду следчы прызнаў Антонаўку - хутар Казіміра Сляскага. Менавіта тут, паводле заключэння, адбывалася фарміраванне ўзброеных груп, падрыхтоўка нападаў на чырвонаармейскія падраздзяленні, арганізацыя агітацыйнай працы і распаўсюд антысавецкіх і антысеміцкіх матэрыялаў. Следчы сцвярджаў, што да арганізацыі атрадаў былі датычныя польскія шпіёны падхарунжы, камандзір 13 уланскага палка Думброўскі і нехта Кендзя, камендант мястэчка Крайск, паручнік Пясецкі, а таксама паручнік Чарнецкі,

[34] Тамсама, с. 77.
[35] Тамсама.
[36] Тамсама, с. 78.
[37] Тамсама.

сяржант Кутарба, капрал Шыманскі *“розныя шляхцічы Польшчы і іншы зброд”*. Характэрна, што большасць арыштаваных не ўзгадвалі гэтых людзей на допытах. Адкуль следчы Цітоў узяў гэтыя прозвішчы, невядома. У матэрыялах справы яны не фігуравалі.

Цітоў абвінаваціў партызанскі атрад ў забойстве старшыні Плешчаніцкага валрэўкама Беляковіча, абстрэльванні адыходзячых чырвоных частках і навядзенні сярод іх панікі, у забойстве ў вёсцы Расохі начальніка сувязі невядомай часткі, а таксама пяці чырвонаармейцаў, целы якіх нібыта прыхавалі ў Антонаўцы. Пры гэтым ніякіх доказаў забойстваў апошніх следчы не прывёў. Цітоў палічыў узгаданыя факты нападаў і забойстваў даказанымі і запатрабаваў прымяніць ў дачыненні да дзесяці чалавек вышэйшую меру пакарання - расстрэл, а да іх сем’яў і іншых фігурантаў - высылку ўглыб Расеі. Двух чалавек Цітоў вызваліў з-пад аховы, а збеглых бандытаў і дызерціраў заклікаў лічыць па-за законам.

Заключэнне падпісалі ваенследчыя В.Цітоў і Озераў (ініцыялы не пазначаны) і зацвердзіў начальнік пагранасобаддзялення №2 – Захфронта. На дакуменце дзве рэзалюцыі: *“Згодны. Каміц. 25.05.21”* і *“Пастанову калегіі асобаддзела Захфронта зацвярджаю. Паўнамоцны прадстаўнік па Заходнім фронце. 26.05.21”* і пячатка *“Усесаюзная надзвычайная камісія па барацьбе з контр-рэвалюцыйнымі злачынствамі. Паўнамоцны прадстаўнік па Заходнім фронце”*[38]. Ва ўвазе следчы запісаў, што адабраныя ў Сляскага пры арышце 19 000 савецкіх і ў Данілевіча Адама 6 000 савецкіх рублёў і 20 мікалаеўскіх рублёў канфіскаваныя ў фонд РСФСР[39].

26 траўня калегія Асобага аддзела Заходняга фронта - пазасудовы рэпрэсіўны орган савецкай улады - заслухала даклад начальніка асобаддзялення № 2 Га(т/ш/ц)учак па справах №№ 224, 225, 275, 298, 141а і 293 Пагранасабадзялення № 2 па абвінавачанні шэрагу грамадзянаў у арганізацыі партызанскага атрада на

[38] Тамсама, с. 79.

[39] Тамсама.

карысць Польшчы і распаўсюджванні пракламацій на карысць Балаховіча і шпіянажы. Калегія пастанавіла расстраляць Сляскага Казіміра, Каспіровіча Эдуарда, Дэйнера Іосіфа, Мішкініса (Мішкіна) Міхаіла, Кішкурну Пятра, Даніловіча Адама, Трухіна Івана, Максімовіча Андрэя, Кудревіча Антона, Міхновіча Степана. Таксама калегія пастанавіла выслаць Спявацкую Соф'ю, Сляскую Станіславу (дачку Казіміра Сляскага), Лукашонак Марыю, Максімовіч Франца, Леадамскіх Кліменція Фелікса і Станіслава, а таксама сем'і расстраляных у глыб Расеі праз Аддзел Упраўлення, перадаць іх пад негалосны надзор УНК, а іх маёмасць канфіскаваць і здаць Барысаўскаму ўезднаму выканкаму. Мішкіна Канстанціна і Ісайчук Ядзвігу калегія вызваліла з-пад варты і перадала пад негалосны нагляд міліцыі тэрмінам на адзін год. Удзельнікаў атраду, якія схаваліся ад пераследу, Куліка Андрэя, Сухадольца Пятра, Андрушкевіча Станіслава, Каспіровіча Адольфа, Леадамскіх Пятра, Ігнання, Каспіровіча Уладзіслава, Юрэвічаў Пятра і Ігната, Баньkоўскага Эдуарда, Дэйнераў Франца і Адольфа, Мішкіна Ярослава, Шумана, Зелянко Антона і Жука Івана калегія абвесціла ў вышук. На выспісцы з пратаколу паседжання калегіі допіс старшыні Барысаўскага уезднага выканкама ад 24 чэрвеня аб выкананні высялення сям'яў і канфіскацыі іх маёмасці[40]. Па прычыне адсутнасці ажпаведных дакументаў колькасць сем'яў, іх склад і месцы высялення вызначаныць не ўяўляецца магчымым.

Праз два дні, 28 траўня, расстралялі 9 чалавек. Хто і дзе выканаў прысуд, на жаль, невядома. Чамусьці ў той жа дзень не расстралялі Андрэя Максімовіча. З дакументаў вынікае, што 8 чэрвеня падчас канваіравання да месца расстрэлу ён уцёк і быў абвешчаны ў вышук[41]. Далейшы лёс яго невядомы.

Апошні, хто трапіў у поле зроку надзвычайнай камісіі, быў 21-гадовы Пётр Сухадолец. Упершыню яго арыштавалі яшчэ ў студзені

[40] Тамсама, с. 80.

[41] Тамсама, с. 94.

1921 г. за ўхіленне ад мабілізацыі падчас наступлення Чырвонай арміі на Варшаву. Аднак пазней у сакавіку яго ўсё ж мабілізавалі і скіравалі ў Менск у 2 дывізію 6 роту. Праз месяц хлопец захварэў, трапіў у шпіталь у Воршы, адкуль яго адпусцілі дадому ў родную вёску Ляўданшчына. Там 4 ліпеня 1921 г. за дэзерцірства і ўдзел у бандзе Сляскага яго арыштаваў Асобы аддзел УНК 16 арміі. Сухадолец утрымліваўся пад вартай у Смаленску ў Доме папярэдняга зняволення. 18 жніўня ўпаўнаважаны 2-га аддялення асобаддзела Заходняга фронта Міхаіл Мірановіч запатрабаваў для яго вышэйшую меру пакарання - расстрэл. Аднак 24 жніўня Калегія Асобага аддзела Захфронта замяніла расстрэл 1 годам прымусовых прац[42]. Далейшы лёс Пятра Сухадольца вызначыць не ўдалося.

Нягледзячы на рашэнне аб высылцы расстраляных, вядома, што жонка Казіміра Сляскага Марыя Якаўлеўна Сляская з сынам Антонам Казіміравічам жылі на хутары Антонаўка ад 1930 г., калі савецкая ўлада пазбавіла іх выбарнага права і саслала як былых "памешчыкаў" у Астраханскую вобласць. Максімовіч Франц паўторна быў асуджаны 19 лістапада 1937 г. на 10 гадоў лагераў за антысавецкую агітацыю. Пакаранне адбываў у Белбалтлагу[43].

У 1992 г. Беларуская вайсковая пракуратура прыняла рашэнне аб рэабілітацыі ўсіх фігурантаў справы. Ці былі рэабілітаваныя сасланыя сем'і, застаецца невядомым.

## Bibliografia

Archiwum Akt Nowych (AAN), sygn.: 2/2478/0/2/651.

*Sluckì zbrojny čyn 1920 g. u dakumentah ì ŭspamìnah,* ukl.: A. Ges′, U. Lâhoŭskì, U. Mìhnûk, Mensk 2006 [*Слуцкі збройны чын 1920 г.у дакументах і ўспамінах,* укл.: А. Гесь, У. Ляхоўскі, У. Міхнюк, Менск 2006]

[42] Тамсама, с. 94.

[43] Анкета Франца Максімовіча. https://ru.openlist.wiki/%D0%9C%D0%B0%D0%BA%D1%81%D0%B8%D0%BC%D0%BE%D0%B2%D0%B8%D1%87_%D0%A4%D1%80%D0%B0%D0%BD%D1%86_%D0%A4%D0%BE%D0%BC%D0%B8%D1%87_(1885) Доступ 29.03.2025.

Stuzhynskaya, N. I. *Belarus myacezhnaya. Z gistoryi ўzbroenaga antysaveckaga supracivu: 20-ya gg. XX st.* Vilnya 2000 г. [Стужынская, Н. І. Б*еларусь мяцежная. З гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 20-я гг. XX ст.* Вільня 2000].

Stužynskaâ N., *Cluckae paŭstanne,* dostęp 29.03.2025 [Стужынская Н., *Слуцкае паўстанне,* Доступ 29.03.2025]. https://history-belarus.com/images/img-events/uprising_sluzk/slutskae_paustanne_N-Stuzinskaja.pdf]

Tihomirov A., *Problemy opredeleniya vostochnoj granicy Polshi v 1920–nachale 1921 g.* [Тихомиров А., *Проблемы определения восточной границы Польши в 1920–начале 1921 г.*] Evolutio.info. ttps://evolutio.info/ru/journal-menu/2004-2/2004-2-tihomirov

**Anti-Soviet partisan detachment in Pleshchanytskyi volost, Borisov district in the light of the materials of the group criminal case of 1921**

The article presents an analysis of the materials of the criminal case, which is stored in the Archiwum Akt Nowych (fund 2478, file 651) and contains documents from the KGB archive (file No. 32449-c) on the activities of an anti-Soviet armed formation that operated on the territory of the Pleshchanytsky volost of the Borisov district of the Minsk province since the autumn of 1920.

The case titled Akta karno-śledcze w sprawie Edwarda Kasperowicza i innych oskarżonych o członkostwo w oddziałach gen. Bułak-Bałachowicza i o dyłystący agenturalną w 1921 r. na froncie zachodnim contains 110 pages. These are the questionnaires of the arrested, interrogation protocols, materials of personal statements, conclusions and resolutions of the bodies of the Special Department of the Western Front, appeals of local residents, as well as documents on rehabilitation. The materials include photographs of individual members of the detachment.

A total of 19 people aged 17 to 54, mostly Roman Catholics, were involved in the case. 10 of them were sentenced to execution by an extrajudicial body. Others were exiled or transferred to the supervision of the UNK and milice.

The documents reveal the details of the investigation, including the testimonies of the arrested and their stories about the activities of the armed formation. The chronological boundaries of the case are from March 28 to August 18, 1921.
Keywords: Polish-Soviet War 1919-1920, anti-Soviet armed resistance, Kazimir Slaski